Лаўрык Т.А., дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», Мінск

# Аповесць «Салавей» Змітрака Бядулі ў водгуках пісьменнікаў 1920-х гадоў.

Сваёй творчасцю Змітрок Бядуля садзейнічаў станаўленню ў першай палове ХХ стагоддзя розных жанраў беларускай літаратуры. Ён быў паэтам, празаікам, даследчыкам фальклору, літаратуры і тэатра.

У 1920-я гг. пісьменнік далучыўся да літаратурна-грамадскага жыцця, уступіўшы ва Усебеларускае літаратурнае аб'яднанне паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк». Гэта быў адзіны сталы аўтар, які стаў сябрам згуртавання моладзі. На той час яму было ўжо 37 гадоў, а большасці «маладнякоўцаў» – 16–20 гадоў. Аднак «бурапенная» творчасць пісьменнікаў гэтага аб'яднання перастала яго задавальняць у сярэдзіне 1920-х гг. У 1926 г. Змітрок Бядуля далучаецца да аб'яднання «Узвышша». Як і ўдзельнікі гэтага згуртавання (А.Бабарэка, У. Дубоўка, Я. Пушча, А. Адамовіч, К. Крапіва і іншыя), Бядуля не ўспрымаў літаратуру як «сродак палітычнага выхавання мас». Літаратура павінна быць незалежнай ад палітыкі і выступаць узвышшам для выхавання моладзі.

Свой уклад у станаўленне жанру гістарычнай прозы пісьменнік зрабіў аповесцю «Салавей» (1927). У гістарычнай жанры да гэтага часу ўжо былі напісаны асобныя творы Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Вацлава Ластоўскага і Максіма Гарэцкага. Кожны аўтар ставіў свае мэты пры напісанні гістарычных тэкстаў. Для В. Ластоўскага і М. Гарэцкага – гэта фарміраванне самасвядомасці беларускай нацыі.

З сярэдзіны 1920–1930 гг распачаліся даследаванні савецкай гістарычнай раманістыкі. А. Кашынцаў у 1930 г. спрабаваў правесці класіфікацыю гістарычнай раманістыкі, вызначаў асноўныя прыкметы гістарычнай прозы: адлюстраванне вядомых асоб, падзей, гістарычнага асяроддзя. Ёсць падставы па некаторых прыкметах вызначыць гістарычную

аснову аповесці Змітрака Бядулі. Кашынцаў гаворыць пра тое, што даволі часта межы паміж гістарычным і негістарычным тэкстам згладжваюцца, таму адрозненні паміж імі не выяўляюцца [5, с. 40].

У аповесці Бядулі не сустракаецца ніводнага легендарнага дзеяча, гістарычнай постаці, але прысутнічае гістарычнае асяроддзе. Адзінай рэальнай асобай выступае К. Марашэўскі, у тэатры пана Вашамірскага ажыццяўлялася пастаноўка яго п’есы «Камедыя» (1787). Пісьменнік «даволі вольна абыходзіцца з гістарычным матэрыялам. У аповесці расказваецца, напрыклад, што імператрыца Екацярына II праязджала праз Беларусь і спынялася ў маёнтку Вашамірскіх» [7, с. 75]. Але пад Мінскам яна не была, гэта мастацкі вымысел аўтара. Падзеі ў творы адбываюцца ў часы паншчыны (паміж 1787–1793 гг.), апавядаецца пра існаванне прыгонных тэатраў, што таксама вядомы факт. Гэта дае падставы разглядаць аповесць як гістарычную. Яе галоўная ідэя – адлюстраваць разлажэнне, загніванне, хваравітасць псіхікі панства, на змену якому прыходзяць вольныя рабочыя і сяляне (пасля таго як адбылася Кастрычніцкая рэвалюцыя). Знішчыць паноў у творы – мара сялян, якія церпяць гвалтаванне над імі ад пана Вашамірскага. Аўтар стварае натуралістычныя малюнкі здзеку над асобай, асабліва яскрава падаецца яна пры апісанні «генеральнай рэпетыцыі», якая ва ўспрыманні сялян была жывой асобай і патрабавала шмат увагі да яе пана [2, с. 109].

З боку савецкай крытыкі высока ацаніў аповесць **Сяргей Замбржыцкі**. Дакладна невядома, што гэта быў за чалавек. Даследчыкі называюць некалькі асоб з гэтым прозвішчам: выкладчык 15-й беларускай сямігадовай школы Замбржыцкі, сведчанне пра якога засталося дзякуючы Уладзіміру Сядуру-Глыбіннаму[1]; у 1928–1931 гг. у Белпэдтэхнікуме выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры працаваў Сяргей Замбржыцкі (сведчанне А. Астрэйкі, Л. Маракова); С. Замбржыцкі друкаваўся пераважна ў часопісе «Полымя» (літаратурны крытык, рэпрэсаваны ў 1930-я гг.). Ці гэта адна і тая ж асоба – невядома. С. Замбржыцкі пісаў: «Прыгонны быт спараджае хваравітую,

[1] Юрэвіч, Л. Архіўная кніга. Беларускі інстытут навукі й мастацтва: Нью-Ёрк, 1996

загніўшую псіхалогію тых, хто жывіцца прыгонам і не дае магчымасць выявіцца творчым сілам тых, кім жывяцца» [4, с. 195]. Замбржыцкі падкрэсліў удала выяўленую хваравітасць псіхалогіі старой пані з яе ўлюбёнасцю ў катоў. Падкрэсліў крытык і стыль аповесці – «маляўнічасць, сакавітасць і свежасць хварбаў» [4, с. 196]. У творы, па словах даследчыка, выявіўся пісьменніцкі ўзрост, Бядуля распрацаваў глыбокую і шырокую, дасюль нябачную ў яго творчасці, каштоўную тэму.

Даследчыца З. Мельнікава слушна пісала, што аповесць «Салавей» набліжаецца да рамана сваёй колькасцю герояў, кампазіцыяй, прычым гэта аповесць гістарычная, аднак гістарызм яе ўяўны, па форме канцоўкі твор нагадвае казку. Узвышэнскія крытыкі А. Адамовіч і А. Бабарэка пісалі пра сутнасць аўтарскай задумы і сродкі яе ўвасаблення ў творы. Фактычна, Бядуля выкарыстаў гістарычны сюжэт з часоў прыгону, каб такім чынам «пераапрануць» сучасныя яму падзеі. У 19251926-я гг. пісьменнік пазбавіўся ілюзій наконт сапраўднай беларусізацыі, ён звяртаецца да тэмы народных талентаў ва ўмовах сацыяльнага бяспраўя. У сучасных Бядулі ўмовах, будучы тэатральным крытыкам, ён назірае дачыненне бальшавікоў да беларускага тэатра, мастацтва і нацыянальнага развіцця Беларусі ўвогуле [6, с. 193].

**Адам Бабарэка** – першы беларускі крытык, літаратуразнавец, адзін са стваральнікаў літаратурнага згуртавання «Маладняк», а пазней і «Узвышша» адзначаў, хто з’яўляецца сацыяльным аўтарам аповесці, каго мае на ўвазе пісьменнік пад гасцямі пана Вашамірскага, якія сабраліся паглядзець містэрыю, пастаўленую яго прыгонным тэатрам: «сацыяльным аўтарам выступае інтэлігенцыя, якая выйшла з вёскі і звязвала пэўны час свой лёс з лёсам народу (галоўным чынам, сялянствам), а потым розумам пасягнула ідэі пралетарыяту і перайшла да яго на службу» [1, с. 97]. Даследчык адзначыў набліжанасць твора да рамантычнага накірунку, прысутнасць Бядулевай манеры ў паэзіі, якая перайшла і на празаічны твор. Ідэя аповесці – шуканне абсалютнай каштоўнасці. Змітрок Бядуля сцвярджае здольнасць беларускага

народа да самабытнай творчасці, таму героямі твора становяцца акцёры прыгоннага тэатру, якія таленавіты самі па сабе, але мастацтва і мастак не выносяць духоўнага рабства. Зразумела, чаму ўсё заканчваецца смерцю прыгнятальніка і знішчэннем маёнтка, дзе здзекваліся над акцёрамі. У гэтым аповесць набліжана да «Сымона-музыкі» Якуба Коласа, «Кургана» Янкі Купалы і «Люцыяна Таполі» Максіма Танка, якія таксама заканчваюцца ідэйнай перамогай народа і сцвярджаецца вялікая роля мастацтва ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе беларусаў.

**Тодар Глыбоцкі (Алесь Дудар)** асуджальна гаворыць пра аповесць Бядулі ў сваім крытычным артыкуле «Пад шыльдай пралетарскай літаратуры», у якой аўтар раскрытыкаваў пісьменнікаў «Узвышша». На той час якраз ішло змаганне паміж «маладнякоўцамі» і «ўзвышэнцамі». Ён адзначыў, што спрабуючы стварыць гістарычны малюнак прыгоннага тэатру на фоне прыгону, Бядуля не скарыстаўся навуковымі матэрыяламі. І гэта адзначаюць і іншыя даследчыкі, паказваючы мастацкі вымысел, які перабольшвае рэальныя падзеі ў творы. Гэта прывяло да «трафарэтных прыёмаў агіткі і прыніжэння мастацкай вартасці твора» [3, с. 221].

**Прафесар Піотуховіч** у наступным нумары «Маладняка» (№ 5 за 1927 г.) услед за Глыбоцкім высока адзначыў аповесць «Салавей», якой на той час была надрукавана толькі першая частка. Ён далучыў твор да буйных твораў Кузьмы Чорнага і Уладзіміра Дубоўкі, якія выйшлі на той час у часопісе «Узвышша» (№ 1 за 1927 г.). Ён адзначае «характэрнае для Бядулі злучэнне тэм псіхалагічных і сацыяльных» [8, с. 92]. Адна з важных тэм, якая назіралася і ў іншых творах пісьменніка  псіхалогія мастака-самародка, якая выяўлялася ў новым сацыяльным антуражы. Але, як і Тодар Глыбоцкі, Піотуховіч зазначыў, што гістарычны твор патрабуе вывучэння крыніц, а для Бядулі матэрыялы па гісторыі тэатру засталіся недаследаванымі. Таму і назіраецца адсутнасць сапраўднага ў творы, не хапае мастацкага афармлення.

Сам Змітрок Бядуля, адчуваючы, што «Салавей» не ўкладваецца ў рамкі гістарычнага жанру, называе яго белетрызаваным творам, казачнай,

прыгодніцкай аповесцю. Калі параўнаць выданні твора ў часопісным варыянце (1927, 1928 гг.) з кніжным выданнем 1932 года, то для кнігі тэкст быў істотна перапісаны. У апошнім варыянце тэма вольнага мастацтва перарасла ў больш шырокую тэму – змаганне прыгонных сялян супраць прыгнятальнікаў.

Такім чынам, пісьменнікі 1920-х гадоў адзначылі каштоўнасць аповесці «Салавей», яе глыбокую псіхалагічную аснову, набліжанасць да гістарычных твораў, але недастаткова вывучаную аўтарам тэму прыгонных тэатраў і жыцця народа падчас прыгонніцтва. Твор рамантычны, гэта казачная, прыгодніцкая юнацкая аповесць, якая пісалася для моладзі. Адзначалася таксама і «прыхаваная» гістарычнай тэмай спроба пісьменнікам паказаць сучаныя яму падзеі, якія закраналі развіццё нацыянальнай культуры беларускага народа падчас прыходу бальшавікоў да ўлады.

**Спіс літаратуры**

1. Бабарэка, А. Пра Бядулеву аповесць «Салавей» / А. Бабарэка // Узвышша. – 1929. – № 2. – С. 95–97.
2. Бядуля, Змітрок. Салавей / Змітрок Бядуля // Выбраныя творы / Змітрок Бядуля. – Мінск : Кнігазбор, 2006. – С. 57–198.
3. Глыбоцкі, Тодар. Пад шыльдай пралетарскай літаратуры / пад псеўд. Тодар Глыбоцкі // Маладняк. – 1927. – № 4. – С. 220–228.
4. Замбржыцкі, С. «Узвышша». Часопіс літаратуры, мастацтва і крытыкі № 1 за 1927 г. / С. Замбржыцкі // Асвета. – 1927. – № 5/6. – С. 194–201.
5. Кашинцев, А. Исторический роман в современной литературе / А. Кашинцев // На литературном посту. – 1930. – № 3. – С. 39–47.
6. Мельнікава, З. Н. «На горне душы…». Творчасць Змітрака Бядулі і беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя / З. Н. Мельнікава. – Брэст : Брэсц. дзярж.ун-т імя А.С. Пушкіна, 2001. – 222 с.
7. Навуменка, І. Змітрок Бядуля / І. Навуменка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 144 с.

8. Піотуховіч. «Узвышша». Часопіс літаратуры, мастацтва і крытыкі № 1 за 1927 г. / праф. Піятуховіч // Маладняк. – 1927. – № 5. – С. 92–95.